*Рыгор Шаура*

# СПАСЦІГАЮЧЫ САКРЭТЫ ТВОРЧАСЦІ

(Справаздачная выстаўка работ клубаўцаў: роздум і меркаванні)

У студзені сёлетняга года адбылася VIII справаздачная выстаўка работ членаў народнага клуба-студыі самадзейных мастакоў і майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Мінска, прысвечаная 60-годдзю ўтварэння СССР. На ёй экспанаваліся творы жывапісу, графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Дзевяць гадоў існуе клуб. За гэты час набыты немалы вопыт у вырашэнні арганізацыйных, вучэбна-творчых і методыка-кансультацыйных пытанняў. Клуб самадзейных мастакоў мае свае традыцыі, сваю методыку ў правядзенні вучэбна-выхаваўчай работы ў калектыве. І менавіта на вопыце яго дзейнасці ёсць падставы меркаваць пра важнасць і перспектыўнасць творчых клубаў самадзейных мастакоў у параўнанні з гурткамі выяўленчага мастацтва і студыямі.

Справаздачная выстаўка — гэта вынік вялікай і карпатлівай працы. Амаль усе работы ўпершыню былі прадстаўлены перад шырокай аўдыторыяй гледачоў і, натуральна, пакінулі глыбокае ўражанне (пра гэта сведчаць шматлікія водгукі наведвальнікаў выстаўкі). У экспазіцыі мы ўбачылі мастацкія творы самага рознага жанру— тэматычныя карціны, пейзажы, партрэты, графічныя аркушы на тэмы казак і літаратурных твораў, вырабы з дрэва, металу і іншых матэрыялаў. Прыемна, што майстры самадзейнага мастацтва прадэманстравалі сваё самае непасрэднае далучэнне да актуальных і важных задач сучаснасці, сродкамі вобразнага пераасэнсавання выказалі асабістыя адносіны да надзённых падзей і жыццёвых спраў.

У тэматычных карцінах самадзейныя мастакі па-свойму паспрабавалі раскрыць тэму 60-годдзя ўтварэння СССР, яны прысвяцілі творы юбілеям Янкі Купалы і Якуба Коласа, вытворчым дасягненням працоўных.

Карціна «Садружнасць» М. Капітанчука, напрыклад, прысвечана тэме дружбы і братэрства ўсіх нацый і народнасцей нашай шматнацыянальнай краіны. У аснове кампазіцыі — эпізод ускладання кветак да помніка У. І. Леніну прадстаўнікамі саюзных рэспублік. Аўтар у простай, здавалася б, некалькі апісальнай манеры кампазіцыйнай пабудовы палатна раскрывае глыбокі змест аднадушнай вернасці ідэям Леніна ўсіх людзей Савецкага Саюза, з'яднаных у адну вялікую сям'ю.



І. Абравец. Маці і хлеб. Цэнтральная частка трыпціха. Алей. 1982.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У трыпціху «Хлеб» мастак І. Абравец ставіць асноўны акцэнт на цэнтральнае палатно «Маці і хлеб» і дастаткова ўдала, на наш погляд, выкарыстоўвае алегарычны прыём зместавага вытлумачэння. Глядач прачытвае ў гэтай серыі работ філасофскую думку пра хлеб як крыніцу жыцця, матэрыяльнага і духоўнага багацця людзей.

З пачуццём любві і павагі да класікаў беларускай літаратуры стварыў карціну «Паэты Беларусі» самадзейны жывапісец В. Аляксеенка. У трохі фатаграфічнай манеры, але душэўна адкрыта, шчыра і непасрэдна прадставіў аўтар вобразы беларускіх паэтаў: яны ў задуменні, заклапочаны зямнымі справамі, лёсам людзей.

Вось ужо на працягу некалькіх гадоў удзельнікі клуба дэманструюць прыкметныя поспехі менавіта ў жанры тэматычнай карціны. Тэмы і сюжэты карцін неад'емныя ад важных эпізодаў і з'яў, малых і вялікіх чалавечых праблем. Тэматычная карціна ўсё глыбей адлюстроўвае вытворчасць, сельскагаспадарчую працу, побыт і адпачынак савецкіх людзей.

Выстаўка яшчэ раз паказала, што ў апошні час значнае развіццё ў самадзейным мастацтве атрымалі партрэтны і пейзажны жанры. Непрафесійныя мастакі не абмяжоўваюцца пошукамі толькі знешняга падабенства партрэтуемых, а ідуць да стварэння часам сінтэзаваных, псіхалагічных вобразаў. Мноства работ прысвячаецца людзям працы з іх штодзённымі справамі і турботамі. У жанры партрэта адны аўтары дэманструюць даволі высокі прафесійны ўзровень, арыентуюцца ў творчасці на дасягненне акадэмічнага выканаўчага майстэрства. Другія — грунтуюцца на асабістай душэўнай інтуіцыі і крочаць у мастацтве сваім шляхам, быццам адкрываючы нанава законы і сакрэты выяўленчай творчасці. У гэтым сэнсе пэўную цікавасць мае і графічная работа В. Лушковай «Партрэт». Амаль у лінейнай форме, з лёгкай падмалёўкай колеравых адценняў мастачка па-майстэрску стварае вобраз маладой дзяўчыны. У рабоце адчуваецца псіхалагічная завостранасць і багацце душэўнага настрою.

На выстаўцы былі прадстаўлены і пейзажы. Можна было заўважыць, што самадзейныя жывапісцы ад пейзажу камернага, лірычнага ўздымаюцца да пейзажу эпічнага, часам манументальнага гучання.

У кнізе водгукаў гледачы з асаблівай цеплынёй адзначылі работы В. Стрэпетава («Лета», «Восень», «Зіма», «Вясна»), В. Саладкова («Старое рэчышча»), П. Гольцава («У вёсцы»), а таксама лірычныя акварэлі П. Красавінай, В. Класінскага і іншых мастакоў.

На выстаўках самадзейнага мастацтва звычайна шырока прадстаўлены жанр нацюрморта. Неаднойчы мы сустракаліся з работамі Л. Орліс, С. Вартанава, П. Красавінай, Г. Гаўрыленкі і іншых. Менавіта ў нацюрморце больш глыбока адчуваюцца традыцыі народнага жывапісу, прыкметная сувязь з роспісам куфраў, насценных дываноў, рэчаў хатняга побыту. Але, на жаль, гэты жанр на справаздачнай выстаўцы быў прадстаўлены малой колькасцю работ. А тут ёсць вялікія і нам здаецца, магчымасці для творчых пошукаў, і нам здаецца, што знойдзецца нямала аматараў мастацтва, якія змогуць раскрыць свой талент у гэтым цікавым жанры.

Што датычыць жывапісу, то трэба заўважыць характэрную яго асаблівасць: бадай што ўсе работы ў экспазіцыі па выяўленчым мастацтве, колерам і ў пэўнай ступені вобразным раскрыццём, як ні дзіўна, былі падобныя між сабой. І падабенства іх у тым, што большая колькасць твораў арыентавана на дасягненне ўзроўню прафесійнага мастацтва. Добра гэта ці кепска? Адказаць на гэтае пытанне адназначна немагчыма. Вядома, нічога благога няма ў тым, што той ці іншы самадзейны мастак хоча быць падобны на прафесіянала, пасляхова засвойвае акадэмічныя правілы малюнка, жывапісу, кампазіцыі. Наадварот, у гэтым ёсць станоўчыя якасці, калі лічыць, што самадзейнае мастацтва з'яўляецца адным з рэзерваў прафесійнага. Але прызначэнне самадзейнай творчасці не ў гэтым. Трэба ўлічваць, што выяўленчая самадзейнасць — гэта перш за ўсё сацыяльна-культурная з'ява і менавіта таму яе асноўныя функцыі не ў падмене задач прафесійнага мастацтва, а ў тым, каб выхоўваць высокую эстэтычную культуру людзей, фарміраваць у іх паняцце прыгожага, уменне самім рабіць гэта прыгожае. І тут існуе шмат шляхоў, па якіх можа і павінна крочыць самадзейнае мастацтва, але гэта ўжо асобная праблема.

Нам вядома па шматлікіх іншых выстаўках работ удзельнікаў клуба разнастайнасць мастацкіх напрамкаў, творчых манер і почыркаў. І вельмі ўражвае гледачоў, калі ў экспазіцыі выставак адчуваецца сапраўды народны дух успрымання творцамі навакольнага свету, нашай рэчаіснасці. Нагадаем апошнюю рэспубліканскую выстаўку самадзейнай мастацкай творчасці. Якім жыццялюбствам, багаццем колера і непаўторнасцю вобразнага бачання рэчаіснасці вызначаліся творчыя работы М. Засінца, Л. Трахалёвай, В. Жарнасека, Б. Тарасенкі, П. Калеснікава і іншых. Хоць нават часам некаторыя экспанаты адрозніваліся па сваёй выканаўчай і вобразнай трактоўцы ад агульнапрынятых у прафесійным мастацтве правілаў. Колькі мастацкай думкі, арыгінальнага мыслення змяшчае ў сабе такая з'ява ў выяўленчай самадзейнасці, як «прымітыў» (ні ў якім разе нельга звязваць «прымітыў» з прымітыўнымі ў мастацкім сэнсе работамі). Творы гэтага напрамку прыцягваюць гледача сваёй незвычайнай і разам з тым глыбока змястоўнай вобразнасцю. Звяртае на сябе ўвагу непаўторнасць знешнеканструктыўнай пабудовы кампазіцыі карціны (у жывапісе), своеасаблівасць творчай фантазіі, дэкаратыўная каларыстычная выразнасць і, што найбольш важна,— пераканальнасць у праўдзівасці, сапраўднасці адлюстраванага, якая проста падкупляе. Працэс трансфармацыі рэальна існуючых прадметаў і з'яў у мастацкія вобразы ў «прымітыве», як вядома, праходзіць у большасці выпадкаў інтуітыўна. Прыродны талент творцы, яго асабістае непаўторнае мастацкае ўспрыманне і адлюстраванне канкрэтнага зместу на плоскасці карціны ці ў аб'ёмнай пластыцы дазваляюць яму ствараць работы, якія перадаюць багатую разнастайнасць быцця. У карцінах, скульптурных работах таго ці іншага аўтара прыкметна выяўляецца яго даверлівасць, душэўная адкрытасць, часам нават просталінейнасць творчай думкі. Самадзейны мастак заўсёды імкнецца перадаць перш за ўсё асабісты ўнутраны свет, свае адносіны да ўсяго навакольнага, і робіць ён гэта па-сапраўднаму шчыра і непасрэдна. Мы ў гэтым пераканаліся на жывапісных работах В. Стрэпетава, П. Гольцава, В. Лушковай і іншых.

Другую частку выстаўкі складалі скульптура і творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Але гэтых работ было значна менш, чым жывапісу і графікі, таму яны некалькі губляліся сярод астатніх экспанатаў. І ўсё ж гледачы падоўгу прыпыняліся перад драўлянай скульптурай малых форм, вырабамі з керамікі, разьбой па дрэве, інкрустацыяй, вязаннем і шматлікімі іншымі відамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Увагу наведвальнікаў прыцягвалі скульптурныя кампазіцыі з дрэва «Лясная казка» народнага майстра А. Сірэнкі, «Спевакі» В. Балыкіна і работы іншых аўтараў. Тут мастакі ў поўную сілу раскрылі творчую фантазію, прадэманстравалі ўменне выказаць глыбіню думкі даволі скупымі, але надзвычай выразнымі сродкамі вобразнага вырашэння, што выходзіць далёка за рамкі візуальнага ўспрымання таго ці іншага твора. Кожны аўтар выказвае менавіта сваю, асабістую «школу» майстэрства ў драўлянай пластыцы і сваё непаўторнае вобразнае бачанне.

Значнае месца ў экспазіцыі выстаўкі займалі работы, выкананыя ў тэхніцы вязання. Цэлую серыю прыкладных вырабаў прадставілі В. Біруля («Абажур», «Палічкі», «Сумкі»), А. Лазарук («Пано»), А. Раманоўская («Прырода»). Народны майстар В. Самойленка, напрыклад, паспрабавала сінтэзаваць у вязанні два віды матэрыялаў — ніткі і саломку. І хоць па кампазіцыйнай структуры атрымалася не ўсё ўдала, яе работа «Сонца Радзімы», прысвечаная 60-годдзю ўтварэння СССР, вельмі зацікавіла гледачоў.

Што датычыць чаканкі па металу, дык тут большасць работ была копіямі вядомых ілюстрацый да літаратурных твораў. Да таго ж некаторыя з іх былі слабыя і па тэхніцы выканання.

У практыцы правядзення выставак работ клуба самадзейных мастакоў Мінска, як і ў іншых калектывах выяўленчай творчасці рэспублікі, існуе тэндэнцыя арыентацыі непрафесійных аўтараў на распрацоўку канкрэтных тэм і сюжэтаў. Гэта, на наш погляд, станоўчая з'ява. Мэтазгоднасць і магчымасць правядзення такой работы ў сферы самадзейнай творчасці пацвердзілі выстаўкі апошніх гадоў, прысвечаныя знамянальным датам і падзеям. Пэўны вынік прадэманстравала і апошняя, справаздачная выстаўка клубаўцаў.

Трэба адзначыць, што арганізацыйная, творчая і метадычная праца Мінскага народнага клуба-студыі самадзейных мастакоў і майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, нават разам з выказанымі заўвагамі, можа быць прыкладам для калектываў выяўленчай творчасці рэспублікі, прыкладам сур'ёзных і адказных адносін як кіраўніцтва, так і ўсіх членаў клуба да вялікай і пачэснай справы ідэйна-эстэтычнага выхавання сучаснага чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ